# Анкета «Дзеяслова»

***1. Чым бачыцца Вам літаратурная творчасьць: нябесным прызваньнем, грамадзянскім абавязкам, прафесіяй, хобі, звычкаю? Што падштурхнула Вас да пісьменьніцкай дзейнасьці. Ці памятаеце свой творчы дэбют? Каго Вы лічыце сваім літаратурным "хросным бацькам"?***

***2. У чым адметнасьць Вашай творчай працы? Які час сутак найбольш плённы? Да якіх "тэхнічных прыладаў" Вы найбольш звыклі: аловак, пяро, шарыкавая ручка, кампутар, дыктафон, інш.? Ці выкарыстоўваеце Вы "творчыя стымулятары": кава, цыгарэты, віно, музыка, інш.? Што для Вас натхненьне і ці чакаеце Вы яго, каб пачаць пісаць?***

***3. Якія цяжкасьці паўстаюць перад Вамі падчас напісаньня твора? Якое значэньне Вы надаеце слову, фразе, рытму твора? Ці зьвяртаецеся падчас пісаньня да даведачнай літаратуры, слоўнікаў, энцыклапедыяў?***

***4. Што/хто найбольш спрыяе ў рэалізацыі Вашых літаратурных задумаў? Што/хто найбольш перашкаджае Вам у гэтым? Ці ўплывае на Вашую творчасьць ацэнка сяброў, рэдактароў, чытачоў? Ці вяртаецеся Вы да напісаных твораў, каб перапісаць іх, перарабіць, удасканаліць?***

***5. Ці задаволеныя Вы сваімі творамі? Што ў Вас не атрымалася ў творчасьці? Чым Вы найбольш задаволены? Якія эпізоды сваёй біяграфіі Вы хацелі б перажыць наноў? Наколькі Вашая біяграфія паўплывала на творчасьць і адбітая ў творчасьці?***

***6. Ці вядзеце Вы дзёньнікі? Як ставіцеся да правіла: "Ні дня без радка"? Ці знаёмае Вам пачуцьцё ляноты, ці змагаецеся Вы з ім (і як)? Калі "не пішацца", што вы робіце, дзе/у чым шукаеце натхненьне?***

***7. Як Вы ставіцеся да інтэрнэт-літаратуры? Ці чытаеце Вы творы сваіх маладзейшых і старэйшых калегаў? Хто з творцаў Вам найбольш блізкі – з беларускіх і сусьветных аўтараў? Назавіце творы, якія Вы любіце чытаць і перачытваць? Ці ёсьць такія ў сучаснай беларускай літаратуры?***

***8. Чаго, на Вашую думку, не хапае сучаснай беларускай літаратуры і што чакае яе ў будучыні? Што пажадалі б Вы тым, хто робіць першыя крокі ў літаратуры?***

# Валянцін Акудовіч



*1.* Літаратурная творчасьць для мяне – гэта патрэба. Натуральная патрэба. Якая, калі заўгодна, мала чым розьніцца ад фізіялагічнай патрэбы. Гэта тое ж самае вывяржэньне шлакаў – толькі вярбальных, якія назапашваюцца ў арганізме ад спажываньня жыцьця.

Але непасрэдна да "пісьменьніцкай дзейнасьці" мяне падштурхнула ня гэтая "фізіялагічная патрэба", а кнігі. Добра памятаю, што як толькі навучыўся чытаць, дык адразу захацелася пісаць кнігі самому. Дзеля гэтага я скраў у старэйшага сябра "аўтаручку", бо малечай ня мог сабе нават уявіць, што кнігі можна пісаць і школьнай асадкай, раз-пораз макаючы пёрка ў атрамант.

Мой "творчы дэбют" адбыўся ў шматтыражнай газеце "Трактар". Гэта быў шэраг вандроўных нарысаў, у якіх я распавядаў пра траверс цэнтральнага Саянскага хрыбту, які мы зрабілі нашай заводскай турысцкай групай (тады я працаваў токарам на Менскім маторным заводзе). Вельмі ганарыўся (употайкі), што ўсе мае нарысы кожны раз аб'яўляліся лепшым матэрыялам чарговага нумару газеты.

Што да літаратурнага "хроснага бацькі" – дык яго ў мяне не было. Разам з тым, будзе цалкам справядліва, калі я вылучу на гэтую ролю Міхася Стральцова, з якім мяне пазнаёміў Леанід Дранько-Майсюк. Уласна, мой літаратурны лёс тут на Беларусі быў запачаткаваны ўвагай Міхася Стральцова да маёй пісаніны. На вялізны жаль, нашае "сяброўства" было жахліва кароткім. І калі Стральцоў памёр, я адразу зразумеў, што ён быў мне блізкі і патрэбны, як бацька, і ня хросны, а як родны бацька.

*2.* У маладосьці я працаваў "з паперай" толькі ноччу. Гэтак атрымалася само сабой. Але пазьней я шукаў і вынаходзіў розныя тлумачэньні на карысьць "савінага" ладу жыцьця. Да прыкладу, я лічыў, што ноччу чалавек больш поўны сабой, чым раніцай, бо тады ў ім сабраная напоўніцу ўся энергія і падзейнасьць прамінулага дня. Да таго ж ноч адсланяе чалавека ад усяго астатняга сьвету і пакідае яго сам-насам. А творчасьць — гэта перадусім адзінота…

Цяпер, і ўжо досыць даўно, я працую (творча) толькі ў першай палове дня. Можа таму, што ў сталым узросьце пражыты дзень ужо ня столькі дадае энергіі, колькі адымае яе, і да ночы чалавек падыходзіць добра спустошаным.

Пішу я толькі "самапіскай" і выключна чорным атрамантам.

Кожны дзень у мяне пачынаецца з цыгарэтаў і кавы незалежна ад таго, займаюся я творчай працай ці не. Таму кава і цыгарэты для мяне хутчэй норма, чым "стымулятар". Разам з тым яны бясспрэчна выконваюць і пэўную стымуляцыйную функцыю.

Дарэчы, я ніколі не пішу ўзяўшы чарку. Калісьці спрабаваў занатоўваць свае алкагольныя трызненьні, але досыць хутка зразумеў: нічога з маіх алкагольных "знаходак" ніякім чынам не тарнуецца з тым, што я раблю на ясны розум.

Я не шукаю і не чакаю "натхненьня", але калі гэткі цуд здараецца, дык адчуваю яго нават фізіялагічна – мне "знутры" робіцца горача. Хаця ня ўпэўнены, што калі б у гэткі момант скарыстаўся "градусьнікам", дык ён засьведчыў бы рэальную падвышку тэмпературы.

*3.* Хаця бальшыня маіх тэкстаў зьвязаная з выяўленьнем мысьліўных інтэнцыяў і таму я, здавалася б, перадусім

мусіў бы дбаць пра мысленьне, як такое, але насамрэч я хутчэй зваблены самой мовай, а ня тым, што імкнуся праз яе выяўляць.

Гэта прагучыць напэўна сьмешна, ды хай сабе: я страшэнна люблю нашую мову. Ёю можна пісаць ні пра што і ні аб чым – і ўсё роўна будзе файна. Апошнімі гадамі, калі паўставала сучаснае беларускае мысленьне, зазначылася яшчэ адна вельмі адметная своеасаблівасьць нашай мовы. Аказалася, што ў ёй прытоеныя неверагодна багатыя магчымасьці для адцягненага рэфлексаваньня. Гэтая мова была створаная для вялікай філасофіі, а яе змарнавалі на вершыкі…

Пры напісаньні тэкстаў ніякай дадатковай літаратурай не карыстаюся. Больш за тое, нават калі падчас працы відавочніцца патрэба нешта ўдакладніць ці пераправерыць, я лянуюся працягнуць руку да паліцы з энцыклапедыямі і слоўнікамі. З гэтага ў маіх тэкстах даволі прыкрых абмылак, бо і сярод рэдактараў хапае такіх самых лайдакоў, як Акудовіч. Разумею, што гэтак ня добра, але так яно ёсьць.

***4.*** Што мне спрыяе ў творчасьці – дасюль не даўмеўся. А замінае (канцэптуальна) той прыкры факт, што ўвесь час даводзіцца думаць, дзе зарабіць хоць якую нішчымную капейчыну. І таму я раз-пораз мушу адкладваць рэалізацыю насьпелых задумаў на нейкае гіпатэтычнае “потым”, якое здараецца досыць рэдка. З іншага боку, каб я быў добра заможным чалавекам, дык можа і ўвогуле нічога б не пісаў, а напоўніцу бавіўся цудам жыцьця… Хто яго ведае?..

Нічые ацэнкі аніяк не ўплываюць на тое, што я раблю. Мне не складана праігнараваць адмоўную рэакцыю блізкіх і дарагіх мне людзей на той ці іншы свой тэкст (або пэўную мясьціну ў тэксьце), аднак я з гэтага ніколі не рэпрэсую тое, што хоча напісацца. Бачыце, мысленьне – гэта перадусім інтэлектуальная мужнасьць і, адпаведна, мысьляр – ня той, хто мае здольнасьць мысьліць, а той – хто не баіцца мысьліць (мысьліць часам бывае вельмі страшна)…

Я не перапрацоўваю свае тэксты, нават калі бачу, што і дзе можна было б зрабіць да лепшага. Але калі перадрукоўваю іх для кнігі (ці якой анталогіі), дык здараецца, што сёе-тое падчышчу, скарачу, але раблю гэта без асаблівай ахвоты. Чаму так? – ня ведаю.

***5.*** Мая ацэнка ўласнай працы цалкам залежыць ад сітуацыйнага настрою. Бывае перачытаю нешта сваё і падумаю: дык, здаецца, ты зусім няблага пішаш, хлопец (і тады пачынаю дакараць сябе, што пісаў і пішу мала). А ў іншы дзень пачытаю тое самае і зануджуся…

Калі я чым і ганаруся, дык гэта не сваімі тэкстамі, а тым, што браў чынны ўдзел у стварэньні некалькіх дыскурсаў, найперш: а) сучаснага беларускага мысьленьня; б) постмадэрну…

Перажываць наноў хоць што з былога ня маю ніякага жаданьня. Чалавек і так жыве залішне доўга. Не хапала яшчэ і падвойваць гэтую цягамоціну.

Што да пытаньня пра зьвяз біяграфіі з творчасьцю... Усе мы палоньнікі сваіх біяграфіяў. Толькі ў творчасьці адных падзеі біяграфіі выяўляюцца наўпрост, а ў творчасьці другіх – ускосным чынам. Пэўна, сярод шматлікіх і самых розных падзеяў, што фармавалі мяне як літаратара, найбольш значная – вучоба ў Літаратурным інстытуце ў Маскве.

***6.*** Калісьці я вёў дзёньнік, аднак тое было даўно. Пасьля замест дзёньніка, як календара падзеяў, пачаў занатоўваць падзеі свайго інтэлектуальнага жыцьця, г. зн. – розныя думкі. Аднак цяпер і гэтага амаль не раблю, бо нарэшце зразумеў адну вельмі простую рэч: сапраўды арыгінальныя думкі здараюцца настолькі рэдка, што калі яны здараюцца – дык іх ужо ніяк не забудзеш.

Мяне ніколі асабліва не турбавала, “пішацца” мне ці не. Калі пісалася – пісаў, калі не пісалася – проста жыў. І добра, што не пісалася даволі часта, бо інакш за бясконцай пісанінай пражыў бы жыцьцё без жыцьця.

Пачуцьця ляноты я ня ведаю, але ў мяне іншая хвароба – паколькі мне заўсёды пісалася цяжка, дык я вельмі хутка незалюбіў пісаць. І таму, натуральна, выкручваюся ад гэтай катаргі як толькі магу. Калі вам на вочы патрапіць якісьці

мой тэкст, дык ведайце – гэта ў мяне не атрымалася выкруціцца.

*7.* Пра літаратуру ў інтэрнэце мне цяжка што-кольвек сказаць, бо зазіраю туды гады ў рады. Да таго ж яна яшчэ толькі шукае свае, прыдатныя для дысплею, формы. Пачакаю пакуль знойдзе.

У мяне склалася “кампанія” з некалькіх дзясяткаў літаратараў і філосафаў, усе новыя тэксты якіх я абавязкова імкнуся прачытаць. І не з прафесійнага абавязку, а з таго, што гэта надзвычай таленавітая “кампанія”.

Што да пытаньня пра “блізкіх” літаратараў, дык гэта пытаньне не да мяне. Бо я цікаўлюся ня “блізкімі”, а тымі, чыя творчасьць цьвеліць і разьвярэжвае маю ўласную творчую ініцыятыву. Тут перадусімі – Фрыдрых Ніцшэ. Сярод сучасных беларускіх літаратараў я першым вылучаю для сябе Янку Брыля. Я ў ціхім захапленьні ад яго: і як ад чалавека, і як ад літаратара.

Перачытваць кнігі не люблю. Мне проста не цікава хоць што рабіць у “другі раз”.

*8.* Сучаснай беларускай літаратуры не хапае толькі аднаго – чытача. Усё астатняе ў яе ёсьць. А калі чагосьці і няма, дык значыць ёй, такой, якая яна ёсьць, гэтага і не патрэбна.

Што чакае беларускую літаратуру ў будучыні? Ясная рэч, нічога добрага там яе не чакае. Зрэшты, як і ўсялякую іншую літаратуру. Лепшыя часы літаратуры ў прамінулым (пра гэта ўжо нават апрыкла і самому гаварыць і ад другіх чуць). Але пакуль ёсьць людзі, якім падабаецца пісаць тэксты, датуль будзе і літаратура. І ўжо іншая рэч – у якой ролі і ў якім значэньні яна будзе. Трохі ж знайшлося месца коням, хаця функцыянальна з іх аніякай карысьці для тэхнакратычнай цывілізацыі. Можа штонебудзь прыдумаюць і для літаратуры. Хаця б з удзячнасьці за тое, што яна гэтую цывілізацыю і стварыла.

Маладым літаратарам я нічога жадаць ня буду. Я іх проста пашкадую, бо ім выпала ня самая ўдалая з магчымасьцяў пражыць жыцьцё. Але паколькі свайму кону пажадана давяраць, дык я параіў бы паставіцца з разуменьнем да свайго наканаваньня. Бо кон рыхтуе кожнаму чалавеку толькі самае лепшае з усяго таго, што ў гэтага чалавека магло быць. І калі нічога лепшага за долю літаратара кон вам не знайшоў, значыць усё астатняе было яшчэ горшым. Зразумела, суцяшэньне тут слабое, але ўжо якое ёсьць…

# Уладзімер Арлоў



*1.* У маім разуменьні сьвет – абсурдны і жорсткі. Я ніколі не належаў да тых, хто знаходзіць у ім усеагульную гармонію. Дамінантай гэтага сьвету ёсьць хаос. Аднак я ведаю, прынамсі, два сродкі змаганьня з гэтым хаосам і абсурдам: творчасьць і каханьне.

Мая “пісьменьніцкая дзейнасьць” пачалася ў першым класе з каханьня да аднакласьніцы Ірачкі. Узімку я часта хварэў і, седзячы дома, марыў, каб хутчэй надышло лета і каб мая каханая патанула ў Дзьвіне. Я ня быў некрафілам і павінен быў пасьпець выцягнуць каханую на бераг і зрабіць ёй штучнае дыханьне – так, як было намалявана на плакатах каля выратавальнае станцыі. Калі ў мроях я даходзіў да таго, як буду ўдзьмуваць са сваіх вуснаў у Іраччыны паветра, сэрца вырастала і пачынала

блукаць па зьдзіўленым дзіцячым арганізьме, адгукаючыся ў самых нечаканых органах.

У тыя хвіліны мяне і апаноўвала нязвыклае дзівоснае пачуцьцё, пра якое я яшчэ ня ведаў, што яно называецца натхненьнем. Яно ўладна змушала хапаць аловак і ліхаманкава занатоўваць на аркушах у касую лінейку радкі з прызнаньнямі ў каханьні – мае першыя паэтычныя творы, якія я гэтаксама ліхаманкава кідаў у грубку, калі чуў, што бацькі вяртаюцца з працы. Мне ўяўлялася, што вершы – гэта такі інтым, такая таямніца, што пра яе, апроч аўтара, дазволена ведаць хіба толькі агню.

Маім дэбютам былі творы, зьмешчаныя ў самавыдавецкім альманаху “Блакітны ліхтар”. Забыць гэты дэбют цяжка, бо ўсімі дэбютантамі (у тым ліку маім сябрам і сталым аўтарам “Дзеяслову” Вінцэсем Мудровым) потым доўга займаліся літаратуразнаўцы з КДБ. Недзе ў архівах гэтай установы зьберагаюцца для нашчадкаў і ўсе сканфіскаваныя ў нас пятнаццаць нумароў альманаху.

Наконт “хроснага бацькі”. Рызыкну сказаць, што іх у мяне два. На семінары маладых літаратараў ў Каралішчавічах сьветлай памяці Ян Скрыган зрабіў выдатную рэкламу аднаму з першых маіх апавяданьняў “Добры дзень, мая Шыпшына”, абвінаваціўшы аўтара ў апяваньні распусты. Неўзабаве на гэты опус адгукнуўся, напісаўшы мне шмат незаслужаных кампліментаў, Уладзімір Караткевіч. У выніку дзьвюх згаданых падзеяў першая кніжка была без ваганьняў названая мною па тым апавяданьні.

***2.*** *Я* – “жаўрук”. Спробы пісаць уначы нярэдка прыводзілі да таго, што праз гадзіну “натхнёнае” працы я прачынаўся, уткнуўшыся носам у паперу, і канчаткова выпраўляўся ў абдымкі Марфея.

Перапісваць тэкст магу на кампутары, але пішу шарыкавай асадкай, а часам – алоўкам.

“Творчыя стымулятары”... Я ня п’ю кавы, не палю, музыку слухаю ў хвіліны адпачынку. Раней некаторыя тэксты пісаў “у суаўтарстве” з добрым чырвоным вінам. Так, да прыкладу, напісаная дваццаць гадоў таму аповесьць “Час чумы”. Я тады цэлы месяц жыў у вугорскай вёсцы ў Закарпацьці, дзе абыходзіцца без віна было б проста маветонам. Але наогул я ўжо даўно прыйшоў да высновы, што пісаць з дапамогай алкаголю нявартa і, больш за тое, небясьпечна, бо ён стымулюе толькі да пэўнае мяжы, а далей пачынаецца хуткі адкат, што сканчваецца творчай бездапаможнасьцю й чалавечай трагедыяй. Самы красамоўны прыклад, відаць, вядомы кожнаму з чытачоў “Дзеяслову”...

Часам мне здаецца, што наймагутнейшым “творчым стымулятарам” ёсьць каханьне. Расстаньне – таксама.

Натхненьне – тыя хвіліны, а здараецца, і гадзіны, калі ты выпадаеш з гэтай рэальнасьці, калі нечая воля вырывае цябе з плыні часу й падпарадкоўвае адно тэксту. Са мной такое здаралася рэдка, але ўсё ж здаралася. Аднак *яно* ніколі не прыходзіла, калі я адмыслова яго чакаў – толькі падчас працы, на краі неверагоднай стомы, як узнагарода.

***3.*** Ня ведаю, як у каго, а ў мяне пісаньне – гэта заўсёды пераадоленьне матэрыялу. Такі, ведаеце, літаратурны “супрамат”. Суцяшаюся тым, што, як заўважалі класікі, пакутліва пісанае лёгка чытаецца. І наадварот.

Якое значэньне надаю слову, фразе, рытму – пытаньне не да мяне, а да чытачоў, у тым ліку да такой іх катэгорыі, як крытыкі і літаратуразнаўцы.

Слоўнікі... Мне бывае шкада некаторых народжаных у вёсцы калегаў, якія з гэтае нагоды перакананыя, што ўсмакталі мову з матчыным малаком і могуць звысаку пазіраць на “дзяцей асфальту”. Такі комплекс паўнавартасьці часта прыводзіць да таго, што, умоўна кажучы, “вяскоўцы” прайграюць літаратарам-гараджанам і ў багацьці мовы, і нават у яе адчуваньні.

Ну а калі бярэшся пісаць пад крылом у Кліо, ігнараваньне адпаведнай літаратуры прыводзіць да таго, што дружыньнікі полацкага князя Брачыслава

пачынаюць ў XI стагоддзі пячы ў вогнішчы бульбу.

Я цяпер з велізарнай асалодаю перачытваю "Гістарычны слоўнік беларускай мовы". Вось у мяне ў 1-ым томе першая закладка – словам "аўтэнтык" нашы пісьменныя продкі шырока карысталіся ў дакументах ужо ў XVII ст. А побач – "адміністрацыя", "акадэмія", "акцыя", "аўтар", "афектацыя"… Еўропа!

*4.* У рэалізацыі літаратурных задумаў найбольш спрыяе мне, натуральна, мая ўласная персона. Яна ж і найбольш замінае.

Найдаражэйшай для мяне ёсьць ацэнка незнаёмых, а таму бесстаронных чытачоў. Памятаю, як быў шчасьлівы, калі атрымаў ад іх недзе пад дзьвесьце водгукаў на першае выданьне кнігі гістарычных эсэ "Таямніцы полацкай гісторыі".

Да твораў кшталту "Таямніцаў", якія потым выходзілі яшчэ трыма выданьнямі, вяртацца, безумоўна, варта. Нараджаюцца новыя гіпотэзы, дзівосным чынам знаходзяцца ўнікальныя дакументы. Да прыкладу, колькі гадоў таму ў Маскоўскім дзяржаўным архіве старажытных актаў быў адшуканы даўнейшы аўтэнтычны тэкст, прысьвечаны князю Усяславу Чарадзею.

Іншая рэч, калі пісьменьнікі бяруцца канцэптуальна прыхарошваць кан'юнктурныя мастацкія (прынамсі, з прэтэнзіяй на гэта) творы, за якія некалі атрымлівалі Сталінскія прэміі, што цяпер у жыцьцяпісах ды энцыклапедыях сарамліва называюцца "дзяржаўнымі".

*5.* Каб быў усім незадаволены – відаць, зьвёў бы ў хвіліну паняверкі і роспачы рахункі з жыцьцём. Яшчэ больш драматычным выглядае выпадак, калі пісьменьнік усімі сваімі творамі задаволены.

Ганаруся, што маю адданых чытачоў.

Ганаруся, што незнаёмыя людзі перакладаюць напісанае мною на замежныя мовы. Дарэчы, упершыню мой тэкст загучаў на іншай мове дзякуючы эстонцу Олеву Йыгі, які пераклаў Васіля Быкава, Янку Брыля, Івана Мележа. Уяўляеце, якое ўзрушэньне перажыў амаль юны аўтар першай у сваім жыцьці аповесьці "І вярталіся мы…", даведаўшыся, што яна зацікавіла старога мудрага майстра з выспы Саарэмаа. А якой раскошай і якім гонарам было атрымліваць ад яго лісты!

Эпізоды майго жыцьця, пра якія Вы пытаецеся, я ня проста хачу перажыць наноў. Я – няхай пад іншымі імёнамі і ў іншых эпохах – перажываю іх у сваіх кнігах.

Лічу, што ўсе творы любога пісьменьніка – аўтабіяграфічныя.

*6.* Дзёньніка ў класічным разуменьні гэтага слова (жанру) не вяду, але маю правіла весьці яго ў падарожжах. Некаторыя тэксты з маіх кнігаў эсэ "Божая кароўка з Пятае авеню" і "Адкусі галаву вароне" напісаныя як дзёньнікі. Ня выключана, што гэта – якраз праява лянoты, нежаданьне загнаць матэрыял у больш складаную форму.

Дзе/у чым шукаю натхненьне, калі "ня пішацца?" Мо варта ўдакладніць пытаньне: "дзе/у чым/у кім...?" Але ўсё адно не адкажу.

*7.* Я ня здольны чытаць *мастацкія* творы ў Інтэрнэце. Там дзейнічае зусім іншы механізм успрыманьня, у выніку чаго я тэкст проста не ўспрымаю (перапрашаю за каламбур).

Творы калегаў, безумоўна, чытаю і шмат. Але пералічаць ня буду, бо маю алергію на сьпісы. У іх з імёнамі адбываецца тое самае, што і ў букеце з кветкамі: страта індывідуальнасьці.

Найбольш блізкія з беларускіх і сусьветных аўтараў у мяне ёсьць. Але зноў атрымліваецца сьпіс.

Люблю перачытваць "Маю Іліяду" Уладзіміра Караткевіча, "Нясьцерпную лёгкасьць быцьця" Мілана Кундэры, "Тропік Рака" Генры Мілера, "Майстра й Маргарыту" Міхаіла Булгакава…

*8.* Беларускай літаратуры бракуе чытача, але ён ужо чакае яе ў будучыні.

Парада тым, хто робіць першыя крокі, старая, як сама літаратура: можаце не пісаць – не пішыце.

# Мікола Аўрамчык



*1.* Нехта кажа, што творчасьць для яго – гэта нешта сьвятое, выклік боскі. Я б так не сказаў. Для мяне заўжды была зацікаўленасьць менавіта нязвычнасьцю пісаньня, але без уяўленьня пра вялікую значнасьць гэтай працы. Першую рэч, якую я зарыфмаваў, я памятаю. У школьным падручніку другога ці трэцяга класу была старонка з малюнкам востраву Куба і апісаньнем яго прыгажосьці і незвычайнасьці. І я чамусьці напісаў пра гэта верш.

У сямігодцы ў мяне была добрая настаўніца беларускай мовы. Яна першай паказала мне газету "Літаратура і мастацтва", якая толькі пачала выходзіць з 1932 году. І вось з таго часу я яе выпісваў. Мой "хросны бацька" і паэтычны настаўнік Аркадзь Куляшоў. Да вайны ў Менску ў Саюзе пісьменьнікаў быў кабінет маладога аўтара, пра што я вычытаў у "ЛіМе". І ў гэты кабінет я дасылаў свае вершы і апавяданьні. На вершы мне адказваў Аркадзь Куляшоў, на апавяданьні – Кузьма Чорны. Аркадзь Аляксандравіч пісаў мне, вучню дзявятага класу, вялікія й разгорнутыя водгукі на вершы з канкрэтнымі праўкамі ды парадамі.

*2.* У студэнцкім узросьце, калі пісаліся вершы, то думка магла ўзьнікнуць дзе заўгодна – і я мусіў хутка запісаць рыфму, рытмізаваны радок. Пасьля вайны, працуючы ў рэдакцыі, па прыходзе са службы, я клаўся спаць, а апоўначы ўставаў і пісаў. Гэта цягнулася гадоў пяць, пакуль я не пачаў адчуваць змораnасьць ад гэтага. Але вершы вельмі часта пісаліся ўначы: я прахопліваўся і насьпех дзе-небудзь запісваў тым, што траплялася пад руку, а раніцай пачынаў узнаўляць. Прычым верш мог узьнікнуць і з канца, і з сярэдзіны.

Іншая справа – проза. Трэба было зачыняцца ў пакоі на пяць-шэсьць гадзінаў. Для прозы ня трэба натхненьня. Галоўнае – уседлівасьць. Мне заўсёды цяжка давалася празаічнае слова. Падаецца, што ў паэзіі азарэньне ці натхненьне можна штучна выклікаць. Калі шмат думаеш пра нешта, заглыбляешся, яно абавязкова прыйдзе.

Што да прыладаў, то я вельмі люблю друкарскую машынку. Яшчэ з таго часу, як працаваў да вайны ў рэдакцыі. Для мяне самае прыемнае і радаснае – калі верш напісаны і я яго надрукую на машынцы. Кампутар я ня ведаю.

Сьпіртнога ніколі не скарыстоўваў для працы. Узяўшы чарку, баяўся нават думаць, што можна пісаць у гэтым стане.

*3.* Адна з маіх слабасьцяў, проста хвароба, у тым, што я люблю мастацкую дэталь і дакладнасьць матэрыялу. Нават вершы саджуся пісаць толькі тады, калі ўсё спраўджана з даведачнай літаратурай. Пра прозу нават не кажу.

*4.* Вядома, калі былі малымі дзеці, то перашкаджалі. Я ішоў а восьмай раніцы ў рэдакцыю "Маладосьці" (у мяне быў свой ключ), зачыняўся і пісаў вершы. У дванаццаць адчыняў дзьверы, і пачыналі прыходзіць людзі.

Парады для мяне – вялікая справа. Другая мая слабасьць, асабліва ў паэзіі, гэта тое, што калі два чалавекі зрабілі мне адну і тую заўвагу, я неадкладна ж перарабляю. А вяртаюся да вершаў нават і цяпер. І цяпер праўлю напісанае трыццаць-сорак гадоў таму. Гэта я люблю рабіць, калі адчуваю, што трэба, да прыкладу, скараціць, унесьці канкрэтнасьць, выправіць недакладнасьць.

*5.* Уся мая творчасьць, фактычна, аўтабіяграфічная. У нас часта з Іванам Пятровічам Шамякіным былі задорныя

спрэчкі на гэтую тэму. Ён казаў: “Трэба ўмець выдумаць”. Я ня ўмею. Пішу толькі тое, пра што даведаўся з жыцьця. У сваіх вершах я цалкам аўтабіяграфічны.

Не магу сказаць, каб я вельмі ганарыўся сваімі творамі. Ёсьць блізкія да сэрца творы, але я лічу сябе звычайным паэтам.

Вельмі шмат чаго з сваёй біяграфіі хацеў бы паўтарыць. І нават ня толькі пражыць наноў – я многае б цяпер запісаў: пра паездкі па краіне з пісьменьніцкімі дэлегацыямі, ды хаця б пра працу-знаёмства з Танкам, Куляшовым, сяброўства з Піменам Панчанкам, Янкам Брылём, Іванам Мележам.

***6.*** Я заўсёды з усьмешкай ставіўся да выразу “ні дня без радка”. Можа, вядома, і ёсьць пісьменьнікі, якія так працуюць. Дарэчы, Іван Шамякін так працаваў. Ён пісаў кожны дзень, абавязкова сядзеў па некалькі гадзінаў. Гэта ня кожнаму дадзена. Я больш падатлівы лянотце. Лянота мяне размагнічвае. Але калі ўзьнікла нейкая задума вершу, я і цяпер яе стараюся адразу занатаваць празаічнымі радкамі, а тады бяруся за рэалізацыю. Павольна, можа, ня так імклівa, як у юнацтве, але бяз гэтага я не магу.

***7.*** З Інтэрнэтам я абсалютна не знаёмы. Гэта далёкая і недасягальная справа.

Што да перачытваньня, то я вельмі ўсёедны. Мне падабаліся многія пісьменьнікі – і беларускія, і сусьветныя. З беларускай паэзіі для мяне былі вельмі любімыя з юнацкага ўзросту і Янка Купала, і Якуб Колас, і Максім Багдановіч. Пазьней для мяне такімі ж любімымі сталі Максім Танк, Пімен Панчанка, Аркадзь Куляшоў. Яшчэ пазьней – Барадулін, Бураўкін, Някляеў, Жэня Янішчыц, Анатоль Грачаньнікаў, усіх не пералічу. А тым больш нашая проза вельмі цікавая. Я проста ганаруся нашай найбагацейшай літаратурай! Якія ў нас празаікі – пачынаючы ад Гарэцкага і Чорнага і да сёньняшняга дня.

Жывучы ў Крыме (13 гадоў), я любіў перачытваць аповесьці Талстога, раманы Дастаеўскага і “Ціхі Дон” Шолахава. З сусьветнай паэзіі для мяне найбольш любімыя два паэты – Адам Міцкевіч і Міхаіл Лермантаў. Люблю нямецкіх паэтаў – Гейнэ, Гётэ. Як ні дзіўна, класічную французскую паэзію люблю меней. З рускай – Ясенін, Багрыцкі, Маякоўскага і Блока вельмі любіў. А ў савецкай паэзіі колькі было паэтаў, якімі я захапляўся: Яраслаў Сьмелякоў, Міхаіл Сьвятлоў, Мікалай Асееў… Божа мой, Твардоўскі, Ісакоўскі, Кедрын, Рубцоў – па памяці ўсіх не пералічу. Я ў жыцьці сустракаўся з паэтамі, у якіх вельмі абмежаванае кола любімых пісьменьнікаў. Я такога не прымаю. Для мяне цікавыя ўсе паэтычныя школы.

***8.*** Я вельмі мала цяпер чытаю. У мяне ж адно вока, і тое двойчы апераванае. Тым больш, што я ўвесь час у нейкім непастаянным жыцьці, у вандроўках. Я ў вёсцы жыву большую частку, а там не да чытаньня. У Менску я жыву толькі зімой. Мне цяжка нешта прагназаваць.

З маладых да мяне дайшло толькі адно прозьвішча, праз радыё, хаця і ў друку недзе чытаў: Хадановіч. Яго паэзія мяне вельмі ўразіла і заінтрыгавала. Цікава было б з ім пагутарыць. А так я, да жалю, нават імёнаў ня ведаю. Хаця для мяне дасюль усіх засланяе Аркадзь Куляшоў. Такога шматграннага ювелірнага майстра слова ў беларускай паэзіі больш не было. Вядома, з сваімі памылкамі. Але калі б ён сапраўды ня верыў, хіба напісаў бы верш “Камуністы” альбо “Бацьку” – лепшы, як на маё, верш пра Сталіна?..

Пачаткоўцам зычу найперш добрага веданьня літаратуры – сусьветнай і беларускай – і пошукаў свайго шляху. Трэба быць сьмелым і самастойным у пошуках. Пажадана не паўтараць таго, што зроблена іншымі. Нягледзячы ні на што, я скурай адчуваю вялікі нацыянальны ўздым. Такога ў мае часы не было.